Галоўнымі экалагічнымі праблемамі сучаснасці, такім чынам, з'яўляюцца змяненне клімату, станчэнне азонавага слоя, недахоп пітной вады, забруджванне падземных вод, згубны ўплыў пестыцыдаў на здароўе насельніцтва, кіслотныя дажджы, знікненне біялагічнай разнастайнасці, назапашванне ў біясферы рэчываў-ксенабіётыкаў і інш.

***Марэцкі А.І.,*** *дацэнт*

## АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ

У структуры Беларускага універсітэта культуры факультэт завочнага навучання існуе з 1 кастрычніка 1975 года. Зразумела, з таго часу адбыліся вялікія змены не толькі ў жыцці інстытута, які ў 1993 годзе стаў універсітэтам, але і факультэта.

У адпаведнасці з патрабаваннямі жыцця на факультэце пашыралася падрыхтоўка спецыялістаў. Так, калі ў 1975/76 навучальным годзе студэнты вучыліся толькі на дзвюх спецыяльнасцях і шасці спецыялізацыях, то ў 1997/98 навучальным годзе – адпаведна на дзевяці спецыяльнасцях і дваццаці дзвюх спецыялізацыях. Усе спецыяльнасці і спецыялізацыі дзённай формы навучання маюць месца і на завочнай, акрамя літаратурнай работы і дырыжыравання. У той жа час на факультэце ў гэтым годзе адбудзецца першы выпуск па спецыяльнасці "сацыяльная работа", якой няма на стацыянары.

За час існавання факультэта яго закончылі звыш 11 тысяч чалавек. Нельга знайсці такія месцы ў рэспубліцы, дзе б не працавалі нашы выпускнікі на розных пасадах: арганізатарамі і кіраўнікамі народнай самадзейнай творчасці, метадыстамі культурна-асветнай работы, бібліятэкарамі, рэжысёрамі і інш. Сярод іх У.Гром, кіраўнік ансамбля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Крупіцкія музыкі", а таксама многія яго ўдзельнікі, рэжысёр шоў-поп-групы В.Гурыновіч, загадчык Іўеўскага раённага аддзела культуры У.Журавель, муж і жонка Марыя і Мікалай Галадкі са Слуцкага раёна і многія іншыя. Сярод выпускнікоў імёны такіх вядомых спецыялістаў у сферы культуры, як артысты ансамбля "Песняры" В.Дайнека, В.Місевіч, А.Эскін, ансамбля "Сябры" М.Сацура, цырка Ф.Гулевіч, А.Сарокін, многіх прафесійных калектываў.

27 лютага 1996 года быў адкрыты філіял факультэта завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры на базе Мазырскага музычнага вучылішча, дзе ў цяперашні час вучацца 60 студэнтаў на дзвюх спецыялізацыях: харавая музыка (народная) і інструментальная музыка (народная).

На 1 студзеня 1998 года на факультэце налічвалася 1388 студэнтаў, што складае каля 40 % колькасці студэнтаў універсітэта. З іх 1161 вучацца за кошт дзяржаўнага фінансавання, 1227 – на кампенсацыйнай аснове. Колькасць студэнтаў на курсах выглядае наступным чынам: 1 курс – 385, 2 курс – 345, 3 курс – 289, 4 курс – 214, 5 курс – 155. З аддзяленняў самым буйным з'яўляецца культуралогія, дзе вучыцца 651 чалавек, на аддзяленні мастацкай творчасці – 453 і бібліятэказнаўства і бібліяграфіі – 284.

На факультэце прадстаўлены ўсе рэгіёны. У парадку ўзрастаючай ступені карціна выглядае так: з другіх рэспублік – 4 чалавекі, Віцебская вобл. – 148, Брэсцкая вобл. – 173, Гомельская вобл. – 182, Гродзенская вобл. – 185, Магілёўская вобл. – 186, Мінская вобл. – 237, гор. Мінск – 273 чалавекі.

Абсалютная колькасць студэнтаў факультэта (~98 %) працуюць па абранай у ВНУ спецыяльнасці. Студэнты, якія працуюць не па спецыяльнасці, вучацца, як правіла, на кампенсацыйнай аснове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучобе студэнтаў значнае месца займае правільная арганізацыя вучэбнага працэсу. Дапамагчы гэтаму павінен прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта. Дарэчы, ва універсітэце няма ніводнай кафедры, якая не ўдзельнічала б у рабоце факультэта.

Вялікую ўвагу дэканат і кафедры ўдзяляюць вучэбна-выхаваўчаму працэсу на факультэце. Але аб'ектыўна існуе супярэчнасць паміж павелічэннем аб'ёму неабходнай вучэбнай інфармацыі і лімітаванымі тэрмінамі навучання. Гэта выклікае неабходнасць пошуку форм і метадаў удасканалення вучэбнага працэсу. Таму вялікая ўвага надаецца інтэнсіфікацыі і аптымізацыі ўсяго комплексу вучэбна-выхаваўчай работы факультэта. Сярод галоўных фактараў павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці трэба выдзеліць арганізацыю навукова абгрунтаванага планавання самастойнай работы студэнтаў, укараненне ў практыку выкладання апорных канспектаў лекцый (канспектаў-схем) і актыўны ўдзел студэнтаў старэйшых курсаў (на жаль, сёння ён вельмі пасіўны і нясмелы) у фарміраванні комплексу дысцыплін па спецыялізацыях.

Спадзяёмся, што праблема дыстанцыйнага навучання, якая вынесена на абмеркаванне гэтай канферэнцыі, унясе сваю пазітыўную лепту ў актывізацыю вучэбнага працэсу. Дарэчы, апошняя канферэнцыя, цалкам прысвечаная падрыхтоўцы спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, адбылася больш за 10 гадоў таму назад.

Як вядома, інтэнсіфікацыя вучэбнага працэсу ў значнай ступені залежыць ад узроўню арганізацыі і правядзення аўдыторных заняткаў, актывізацыі дзейнасці на іх студэнтаў. І пры тым дэфіцыце гадзін, які непазбежны ва ўмовах кароткатэрміновых сесій на факультэце, рашаючае значэнне набывае максімальная інфармацыйная насычанасць заняткаў. Аддаючы належнае дыстанцыйнаму навучанню, трэба падкрэсліць, што ў сілу аб'ектыўных прычын павінны ўдасканальвацца і другія формы навучання: апорныя канспекты лекцый, канспект-схемы, якія адлюстроўваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лагічную, сэнсавую структуру кожнай вывучаемай тэмы і інш. Распрацоўка такіх канспектаў і выкарыстанне іх у працэсе лекцый студэнтамі інтэнсіфікуе, творча насычае вучэбны працэс, вызваляе навучэнцаў ад значнай долі руціннай работы, псіхалагічна "разгружае" іх, садзейнічае пераключэнню ўвагі з вымаўляемых фраз на сэнсавыя блокі лекцый, іх лагічныя ўзаемасувязі.

Падрыхтоўка канспект-схем, іх тыражаванне і ўкараненне, несумненна, патрабуе ад выкладчыка дадатковых намаганняў і пэўных затрат часу. Аднак гэтыя затраты поўнасцю акупяцца павелічэннем аб'ёму матэрыялу, які засвойваецца за кароткі прамежак установачнай сесіі, актывізацыяй студэнцкай аўдыторыі, павышэннем рэзультатыўнасці самастойнай работы ў міжсесіённы перыяд.

З мэтай выяўлення эфектыўнасці вучэбнага працэсу сярод студэнтаў-завочнікаў дэканат і кафедра псіхалогіі і педагогікі правялі іх апытанне ў час правядзення апошняй лабараторна-экзаменацыйнай сесіі ў студзені 1998 года. У апытанні прымалі ўдзел студэнты V курса. Ананімныя анкеты былі распаўсюджаны сярод усіх студэнтаў. Адказы атрымалі ад 131 чалавека, што складае звыш 86% колькасці студэнтаў выпускнога курса.

Пры ўсёй суб'ектыўнасці адказаў даследаванне паказала, што студэнты-завочнікі дастаткова высока ацэньваюць ролю вучэбных заняткаў ва універсітэце як у плане атрымання дапамогі ў засваенні вучэбнага матэрыялу, так і ў авалоданні методыкай самастойнай работы. Звыш 50% апытаных сярод відаў заняткаў, якія ў найбольшай ступені дапамагаюць засвоіць вучэбны матэрыял, назвалі лекцыю, 39% — семінарскія заняткі. На аддзяленні мастацкай творчасці і культуралогіі падкрэсліваецца і роля індывідуальных заняткаў выкладчыкаў па дысцыплінах спецыялізацый, — 21%. Дарэчы, 68% студэнтаў задаволены якасцю правядзення індывідуальных заняткаў. У даследаванні ж 1994 года лік задаволеных гэтай формай заняткаў складаў 77%.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узровень чытаемых лекцый на працягу вучобы студэнты ацанілі наступным чынам:

| | | 1998 г. | 1994 г. |
|---|---|---|---|
| па спецыяльнасці: | *высокі* – | 42% | 41% |
| | *сярэдні* – | 52% | 49% |
| | *нізкі* – | 6% | 10% |
| па агульнаадукацыйных дысцыплінах: | *высокі* – | 28% | 42% |
| | *сярэдні* – | 64% | 55% |
| | *нізкі* – | 6% | 2,5% |

Па спецыяльнасцях і спецыялізацыях адказ выглядае так.

*Менеджмент СКС.* Па спецыяльнасці: высокі – 44%, сярэдні – 50%, нізкі – 6%; па агульнаадукацыйных дысцыплінах: высокі – 50%, сярэдні – 50%.

*Сацыяльная педагогіка.* Па спецыяльнасці: высокі – 43%, сярэдні – 43%, нізкі – 14%; па агульнаадукацыйных дысцыплінах: высокі – 39%, сярэдні – 61%.

*Сацыяльная работа.* Па спецыяльнасці: высокі – 47%, сярэдні – 53%; па агульнаадукацыйных дысцыплінах: высокі – 29%, сярэдні – 47%, нізкі – 18%.

*Інструментальная музыка (народная).* Па спецыяльнасці: высокі – 15%, сярэдні – 85%; па агульнаадукацыйных дысцыплінах: высокі – 8%, сярэдні – 92%.

*Харавая музыка (народная).* Па спецыяльнасці: высокі – 35%, сярэдні – 48%, нізкі – 17%, па агульнаадукацыйных дысцыплінах: высокі – 13%, сярэдні – 70%, нізкі – 13%.

*Бібліятэказнаўства і бібліяграфія.* Па спецыяльнасці: высокі – 54%, сярэдні – 46%; па агульнаадукацыйных дысцыплінах: высокі – 27%, сярэдні – 69%.

88% студэнтаў адказалі, што вучоба ва універсітэце развівае прафесійныя інтарэсы і здольнасці, 68% навучэнцаў падкрэслілі, што універсітэт апраўдаў іх надзеі. Праўда, 30% адзначылі, што вучоба ва універсітэце поўнасцю ці ў большай меры не апраўдала іх мар і надзей. А 29% адказалі, што шкадуюць у большай ці меншай меры, што паступілі ва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

універсітэт, але закончыць яго трэба. Значыць, задумацца над вырашэннем гэтых пытанняў трэба ўсім нам.

Інтэнсіфікацыя вучэбнага працэсу адбываецца галоўным чынам праз дасягненне максімальнай эфектыўнасці самастойнай работы ў міжсесіённы перыяд. А гэта, у сваю чаргу, патрабуе старраннай навукова абгрунтаванай рэгламентацыі і планавання самастойнай работы ва ўсіх разнастайнасцях яе аспектаў. Кафедры, якія забяспечваюць вучэбны працэс на завочным факультэце, як правіла, плануюць самастойную работу студэнтаў без уліку рэальнага бюджэту часу і без узаемнай каардынацыі, што прыводзіць да нежаданай перагрузкі, нізкай якасці засваення матэрыялу.

Раней праведзенае даследаванне бюджэту часу студэнтаў паказвала, што патэнцыяльны бюджэт часу на тыдзень для самастойнай работы студэнтаў паміж сесіямі вызначаецца 15-17 гадзінамі (фактычныя затраты часу яшчэ меншыя). Прыведзеныя даныя аказаліся істотна адметнымі ў бок заніжэння ад таго часу, які прапаноўваецца кафедрамі для выканання патрабуемага аб'ёму вучэбных заняткаў.

У сувязі з гэтым неабходна ажыццявіць планаванне самастойнай работы на ўсіх курсах у адным ланцугу зыходзячы з рэальнага бюджэту часу студэнтаў. Пры гэтым абгрунтаваныя ліміты часу павінны адпавядаць удзельнай вазе кожнай дысцыпліны ў вучэбным плане, уключаючы карэкціроўку ў залежнасці ад працаёмкасці, забяспечанасці літаратурай вывучаемага курса і г.д. Каэфіцыент працаёмкасці вызначаецца зыходзячы з суадносін часавых затрат на падрыхтоўку прадмета і на аўдыторныя заняткі, вылічаных для стацыянара. Такое планаванне павінна праводзіцца не толькі па сукупнасці ўсіх дысцыплін курса, але і ў ланцугу дысцыплін усіх курсаў. Пасля рэгламентацыі самастойнай работы па курсах і дысцыплінах неабходна зрабіць размеркаванне бюджэту часу ўнутры кожнай дысцыпліны па відах работы: выкананне кантрольнай, курсавой работ, падрыхтоўка да заліку, экзамену.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаванне выявіла рад праблем у арганізацыі самастойнай вучэбнай работы студэнтаў-завочнікаў, а значыць, і ў выкладанні. Як ужо адзначалася, 55% навучэнцаў адказалі, што яны вучыліся не ў поўную меру сваіх сіл і магчымасцей. Сярод прычын, якія не дазваляюць вучыцца з поўнай аддачай, названы розныя. Напрыклад, побач з аб'ектыўнымі (вялікая занятасць на рабоце – 48% і інш.) называюцца і суб'ектыўныя (няўменне правільна размяркоўваць свой час – 38%, не хапае цярпення займацца – 26% і інш.).

Значная доля студэнтаў несістэматычна працавала над засваеннем вучэбных дысцыплін у міжсесіённы перыяд: 28% займаліся толькі па выхадных днях, 25% ад выпадку да выпадку.

У поўным аб'ёме рэкамендуемую літаратуру па агульнаадукацыйных дысцыплінах вывучалі толькі 41% студэнтаў аддзялення бібліятэказнаўства і бібліяграфіі, 34% – аддзялення культуралогіі і 30% – аддзялення мастацкай творчасці.

Ацэньваючы свае ўменні самастойна працаваць над вучэбнымі заданнямі, толькі 49% адзначылі, што працуюць дастаткова добра. Пры гэтым, калі на аддзяленні бібліятэказнаўства і бібліяграфіі ад курса да курса расце лік студэнтаў, якія валодаюць навыкамі самастойнай вучэбнай работы (I курс – 51%, III курс – 57%, V курс – 69%), то на другіх аддзяленнях мы не назіраем такой тэндэнцыі (I курс – 51%, III курс – 39%, V курс – 58%). Каля 40% апытаных працуюць у міжсесіённы перыяд без раней складзенага плана.

Аб недахопах у арганізацыі кіраўніцтва самастойнай вучэбнай работай студэнтаў сведчаць і факты фармальнага падыходу да рэцэнзавання кантрольных і курсавых работ, недаацэнка ў радзе выпадкаў ролі ўстановачных лекцый, адсутнасць падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

Не выконваецца пастанова вучонай рады універсітэта 1994 г. па пытанні арганізацыі і кантролю кафедрамі самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў. Праводзячы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўчую работу да гэтай канферэнцыі, мы папрасілі шэраг кафедраў назваць пытанні, якія разглядаліся на іх пасяджэннях у мінулым і бягучым вучэбных гадах. На жаль, з матэрыялаў 12 кафедраў не відаць, што пытанні дапамогі ў самастойнай рабоце студэнтам разглядаліся ў гэты перыяд. Хутчэй за ўсё аналагічная карціна і на другіх кафедрах.

Адказы студэнтаў сведчаць, што найбольшыя складанасці пры самастойнай рабоце ў іх звязаны з псіхалогіяй, гісторыяй філасофіі, філасофіяй, беларускай літаратурай (гэта агульнаадукацыйныя прадметы), а са спецыяльных – з агульнай псіхатэрапіяй (гр. 512 а), аналізам музычных форм і аркестравай літаратурай (гр. 517), аналізам музычных форм (гр. 519), тэорыяй бібліяграфіі, інфарматыкай (гр. 503-505).

Цікава адзначыць, што, напрыклад, ні адзін студэнт 517, 519 груп не назваў, што авалоданне беларускай літаратурай выклікала вялікія складанасці пры самастойнай рабоце. У той жа час у паралельным патоку (гр. 511-512 а) каля 25% назвалі гэты прадмет. Другі прыклад: 25% апытаных тых жа 517 і 519 груп на першае месца паставілі псіхалогію як дысцыпліну, якая выклікае найбольшыя складанасці пры самастойнай рабоце. А сярод студэнтаў 503-505 груп гэты прадмет не ўпамінаецца ні разу. У гэтым выпадку можна гаварыць аб адсутнасці адзінства патрабаванняў да ведаў студэнтаў.

Павышэнне эфектыўнасці завочнага навучання звязана таксама з патрабавальнасцю да ацэнкі студэнтаў. Большасць студэнтаў (да 70%) ацанілі заданні міжсесіённага перыяду як цяжкія, для выканання якіх неабходны вывучэнне некалькіх крыніц, а таксама аналіз практыкі. І з гэтым нельга не пагадзіцца. І ў той жа час больш палавіны апытаных, займаючыся нерэгулярна, не ў поўную сілу паспяхова здавалі залікі і экзамены.

Навучанне метадыцы самастойнай работы па засваенні вучэбнага матэрыялу, яго планаванні і арганізацыі адзін з важнейшых кампанентаў дзейнасці выкладчыка. Абавязковай умовай паспяховай арганізацыі вучэбна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхаваўчага працэсу на факультэце з'яўляецца поўная забяспечанасць вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратурай.

75% навучэнцаў сярод апытаных указалі таксама на нездавальняючае забеспячэнне бібліятэкі літаратурай (у мінулым апытанні незадаволеныя склалі 68%). Дарэчы, 30% не задаволены культурай абслугоўвання ў бібліятэцы. 55% апытаных лічаць, што ва універсітэце высокая культура работы служб і іх супрацоўнікаў, а 44% не згодны наогул, ці ў значнай ступені не згодны з гэтым сцвярджэннем, што вельмі непрыемна.

Адзначыўшы станоўчую ролю метадычнай дапамогі выкладчыкаў у фарміраванні навыкаў самастойнай работы, звыш 40% студэнтаў аддзялення бібліятэказнаўства і бібліяграфіі і звыш 50% студэнтаў аддзялення культуралогіі і мастацкай творчасці адзначылі, што адным з асноўных шляхоў яе актывізацыі з'яўляецца метад асаблівых проб і памылак.

Асобнае месца ў рабоце з завочнікамі займае распрацаваная выкладчыкамі універсітэта вучэбна-метадычная літаратура. Побач з лекцыямі яна з'яўляецца асноўнай крыніцай атрымання звестак па методыцы выканання вучэбных заданняў у міжсесіённы перыяд. Між тым 61% апытаных не задаволены метадычным забеспячэннем па дысцыплінах (71% навучэнцаў аддзялення культуралогіі, 58% – мастацкай творчасці і 42% – бібліятэказнаўства і бібліяграфіі). І гэта справядліва. Дэканат і кафедры павінны ўзмацніць работу ў гэтым накірунку і тэрмінова выправіць становішча.

Нам трэба пайсці па шляху індывідуалізацыі дамашніх заданняў па спецыяльных дысцыплінах, у большай ступені ўлічваць характар работы студэнтаў, іх вопыт. Кантрольная і курсавая работы павінны насіць творчы характар. Важна таксама распрацаваць практычныя заданні, якія дазваляюць ажыццяўляць паэтапны кантроль за самастойнай работай студэнтаў у міжсесіённы перыяд. У той жа час неабходна прывесці ў адпаведнасць з рэальным бюджэтам часу студэнтаў аб'ём рэкамендуемай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важным фактарам удасканалення работы на факультэце выступае мэтанакіраваная актывізацыя асабістага патэнцыялу студэнтаў. Відавочна неабходнасць пераўтварэння студэнта з пасіўнага рэцыпіента зададзеных інфармацыйных патокаў у актыўнага ўдзельніка засваення, фарміравання і мадыфікацыі дынамічнай сістэмы прафесійных ведаў і навыкаў. Як крок у гэтым накірунку можна разглядаць укараненне ў практыку падрыхтоўкі студэнтаў з улікам спецыялізацыі свабоднага выбару прафілюючых дысцыплін.

На першым этапе рэалізацыі гэтай задумы кафедры вызначаюць цыклы курсаў, якія складаюць тэарэтычнае ядро будучай спецыяльнасці. З'яўляючыся абавязковым кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі, яны займаюць каля 50% фонду гадзін, якія адводзяцца на спецыялізацыю. Астатнія гадзіны ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі размяркоўваюцца паміж спецдысцыплінамі, канкрэтны выбар якіх складаецца з улікам студэнцкай аўдыторыі.

Такі падыход да фарміравання комплексу дысцыплін па спецыялізацыі, з аднаго боку, павышае адказнасць кафедраў і выкладчыкаў за спецкурсы. З другога боку, садзейнічае актыўнаму ўключэнню студэнтаў у арганізацыю вучэбнага працэсу на старшых курсах, дазваляе цесна звязаць вучобу з патрабаваннямі практыкі.

***Мацкевіч Л.С., ст. выкладчык***

## СЛАВЕСНАЕ ДЗЕЯННЕ ЯК ПРАЦЭС МОЎНЫХ ЗНОСІН

Асновы моўных ведаў і ўменняў для студэнтаў факультэта завочнага навучання закладваюцца ў гады вучобы ў сценах універсітэта культуры. Пры гэтым увесь комплекс моўнай дзейнасці студэнта-завочніка, усе формы яго творчага, вучэбнага, грамадскага жыцця, падмацаваныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ